Если случается студенческая свадьба, то обязательно молодожены возлагают цветы к Вечному огню.

Таким образом, историческая память о защитниках крепости способствует патриотическому воспитанию студентов-историков и помогает всему миру сражаться среди живых за мир против новой войны.

*Литература:*

1. Брестская крепость на ветрах истории / Под редакцией В. В. Губаренко, Л. А. Цуприка; Автор концепции и текста А.М. Суворов; Фото А.А. Гладыщук и др. – Брест: ООО «Редакция журнала СЭЗ», 2004. – 152 с.

С.У. Грыбава РІВШ, (Мінск)

## УКЛАД МІНСКІХ ТАТАР У ПЕРАМОГУ НАД ВОРАГАМ У ЧАС ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

Вялікая Айчынная вайна агульнай бядой адгукнулася для жыхароў Беларусі. У разгроме нямецкага фашызму на яе тэрыторыі прымалі ўдзел прадстаўнікі розных нацыянальнасцей, былі сярод іх і беларускія татары. Дадзены артыкул прысвечаны партызанскай і падпольнай барацьбе мінскіх татар у акрэслены перыяд на тэрыторыі Беларусі, а таксама іх удзелу ў баявых аперацыях на франтах вайны.

Есць звесткі аб тым, што ў партызанскім атрадзе імя М.Ф. Фрунзэ 18-й брыгады імя М.Ф. Фрунзе Баранавіцкай вобласці, з 26 мая 1943 г. змагаўся татарын Муха Адам Мустафавіч 1923 года нараджэння. Да вайны ён працаваў у Мінску на хлебазаводзе токарам. 3 ліпеня 1944 г., пасля вызвалення тэрыторыі Беларусі, ён працягваў барацьбу супраць ворагаў ужо ў складзе Чырвонай Арміі [1, лл. 5-6, 29-30].

Ва ўліковай картачцы Хасяневіча Якава Сафаравіча 1904 года нараджэння, якая захоўваецца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, ёсць інфармацыя, што ён з 18 кастрычніка 1943 г. быў сувязным атрада "За Радзіму" брыгады "Беларусь" Мінскай вобласці. Да вайны Хасяневіч Я.С. жыў у Мінску па вуліцы Дабралюбава, 31. Меў жонку Хасяневіч Галіну Сямёнаўну. На жаль, ён загінуў падчас бою з ворагам 25 сакавіка 1944 года і быў пахаваны ў в. Трасцянец. Трагічна склаўся лёс і мінскага татарына Аляксандра Багдановіча, які па ўласнай ініцыятыве пайшоў на фронт у першыя дні вайны. Але, нявывучанаму, неспрактыкаванаму салдату не давялося доўга паваяваць [2, с. 32].

Татарын Гембіцкі Сцяпан Абрагімавіч (Ібрагімавіч) 1926 года нараджэння, які да вайны працаваў рабочым на заводзе "Спартак" у Мінску [3, л. 34], з 4 красавіка 1943 г. па 13 ліпеня 1944 г. змагаўся ў партызанскім атрадзе імя А.В. Суворава брыгады "Народныя мсціўцы" імя В.Т. Варанянскага Мінскай вобласці. Ён быў добраахвотцам залічаны ў атрад, дзе змагаўся з ворагам ў якасці разведчыка [4, л. 53]. Быў два разы паранены. Першы раз у жніўні 1943 г. атрымаў навылетнае кулявое раненне шэі і правага пляча разрыўной куляй падчас бою з паліцыяй пры разгроме гарнізону ворага ў м. Плешчаніцы Мінскай вобласці [5, л. 76]. З 18 жніўня па 10 лістапада 1943 г. знаходзіўся на лячэнні ў шпіталі атрада імя А.В. Суворва [3, л. 100, 139]. Другі раз быў паранены ў грудзі з пашкоджаннем левага легкага, выконваючы баявое заданне ў разведцы ў сакавіку 1944 г. У выніку чаго апынуўся ў шпіталі, дзе папраўляў здароўе

з 22 сакавіка па 14 красавіка 1944 г. [3, л. 150]. У баявой характарыстыцы Гембіцкага Сцяпана Абрагімавіча, змешчанай ў Асабовым лістку па ўліку партызанскіх кадраў, які захоўваецца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, адзначаецца, што ў атрадзе ён паказаў сябе смелым і адважным партызанам. Ён удзельнічаў у шматлікіх адкрытых баях з немцамі ў Плешчаніцкім раёне, а таксама змагаўся з нямецкімі гарнізонамі пры выхадзе з блакады ўлетку 1943-1944 гг. Браў удзел у разгроме варожай аўтакалоны ў раёне Чысты бор – Астравы. З групай партызан падрываў варожыя аўтамабілі на дарогах Далгінава – Ілія, у выніку чаго, 18 чэрвеня 1944 г. былі забіты 3 і паранены 4 нямецкіх салдаты і афіцэры. Два разы ўдзельнічаў у Рэйкавай вайне. За паслугі перад Радзімай Гембіцкі Сцяпан Абрагімавіч быў узнагароджаны медалём "Партызану Айчыннай вайны" 1-й ступені [4, л. 53].

Нялёгкім быў шлях да перамогі і ў мінскага татарына, выпускніка Беларускага палітэхнічнага інстытута (1935 г.), Бякіра Смольскага. Атрыманая ў мірны час спецыяльнасць дапамагла яму паспяхова спраўляцца з абавязкамі падпалкоўніка інжынерных войскаў. Яго 158-ы інжынерна-сапёрны батальён шмат зрабіў па інжынерным забеспячэнні падраздзяленняў Ленінградскага і Волхаўскага франтоў, прайшоў да самай Германіі. Акрамя ўзвядзення мастоў, пракладкі маршрутаў для танкаў, абсталявання камандных пунктаў, мінавання і размінавання мясцовасці, "сапёры" падпалкоўніка Смольскага выконвалі і спецыяльныя заданні – прабіраліся ў тыл ворага і там разведвалі прамежкавыя ўмацаваныя рубяжы, дарогі. Асобыя групы сапёраў узрывалі масты на важных камунікацыях, утвараючы ў варожым тыле "пробкі" [2, с. 32]. Капітуляцыя Германіі не стала апошнім днём ваеннай біяграфіі Бякіра Смольскага: ён быў перакінуты на Далёкі Усход для ўдзелу ў баях супраць Квантунскай арміі. Да дому вярнуўся ў 1946 годзе з ардэнамі Аляксандра Неўскага, Айчыннай вайны 1-й і 2-й ступеняў, Чырвонай зоркі і васьмю медалямі [2, с. 33].

У брыгаду "Жалязняк" (1-ы атрад), якая дзейнічала ў Бягомльскім раёне Мінскай вобласці, 1 студзеня 1944 г. трапіў ураджэнец г. Мінска Мурзіч Якаў Сцяпанавіч (1926 г.н.). Ён да вайны працаваў рабочым. У складзе яго сям'і лічацца бацька Мурзіч Сцяпан Аляксандравіч, маці і дзве сястры. У партызаны прыбыў з в. Гайна Лагойскага раёна Мінскай вобласці. У яго баявой характарыстыцы адзначаецца, што за час знаходжання ў партызанскім атрадзе паказаў сябе дысцыплінаваным партызанам. Даручаную яму зброю ўтрымліваў ў добрым стане. У баявых аперацыях ён не ўдзельнічаў, бо знаходзіўся на гаспадарчай працы ў рэзервовым атрадзе, дзе дакладна і своечасова выконваў усе гаспадарчыя загады камандзіра [6, л. 203].

Як і абсалютная большасць беларусаў, іх суайчыннікі-татары таксама не ўхвалялі зверскія акцыі фашыстаў у дачыненні да яўрэйскага насельніцтва і не раз ў цяжкую хвіліну прыходзілі яму на дапамогу, рызыкуючы ўласным жыццём. На такі геройскі ўчынак адважыліся мінскія татаркі Фаціма Канапацкая і яе дачка Ганна. Яны на працягу года патаемна хавалі ў сваей хаце сям'ю Ісраэля Давідсона, даўшы яму магчымасць разам з жонкаю і трыма дзецьмі пайсці ў партызаны. За гэты ўчынак Фаціме і Ганне Канапацкім Нацыянальны інстытут Катастрофы і гераізму еўрапейскага яўрэйства "Яд-Вашэм" (Іерусалім) надаў званне Праведнікаў народаў свету з уручэннем дыпломаў і медалёў. Іх імёны выбіты на Сцяне гонару ў Алеі праведнікаў згаданага Нацыянальнага інстытута [2, с. 30].

Шмат высакародных і самаадданых учынкаў было здзейснена ўдзельнікамі мінскага падполля. Безумоўна, нельга перааацаніць яго значнасць ў перамозе

над нямецка-фашысцкім захопнікам. У складзе членаў мінскага падполля вялі барацьбу з ворагам і беларускія татары. У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь захоўваецца Пастанаўленне бюро Мінскага гаркома КПБ ад 30 студзеня 1985 года (Пратакол № 18, § 12) "аб прызнанні дзейнасці падпольнай патрыятычнай групы на гарбарным заводзе "Бальшавік" у час Вялікай Айчыннай вайны 1941-45 гг". У складзе ўдзельнікаў групы значацца 15 чалавек, у тым ліку татарын Канапацкі Якаў Матвеявіч (1913 г.н.), які быў яе членам з жніўня 1941 г. па сакавік 1944 г., і яго сястра Канапацкая (па мужу Малаковіч) Роза Матвееўна (1911 г.н.), член групы з снежня 1942 г. па сакавік 1944 г, [7, л. 1]. Асноўная дзейнасць падпольшчыкаў зводзілася да выкрадання з заводу вырабленых скур, хімікатаў, медыкаментаў, солі і перадачы іх праз сувязных партызанам. Таксама падпольшчыкі распаўсюджвалі на заводзе лістоўкі, газету "Звязда". Яны падтрымлівалі цесную сувязь з камандаваннем партызанскай брыгады "Народныя мсціўцы" імя В.Т. Варанянскага і атрадаў: "Мсцівец", імя А.В. Суворава, імя І.Р. Катоўскага Мінскай вобласці, выконвалі іх заданні [7, л. 1]. Канапацкі Якаў Матвеявіч пачаў працаваць на заводзе "Бальшавік" у 1932 годзе строгальшчыкам, пасля акупацыі г. Мінска ў 1941 г. працягваў сваю працу ў 2-м цаху гэтага ж завода, бо з горада выйсці не паспеў, а ў Чырвоную Армію не змог трапіць па стану здароўя [7, л. 59]. Першапачаткова ў жніўні 1941 г. падпольная група стварылася ў складзе У.Ф. Гаеўскага (кіраўнік групы), Я.М. Канапацкага (намеснік кіраўніка групы), Р.І. Наркевіча, Ф.І. Гаеўскага. Працу групы накіроўвала член ВКП(б) В.Ф. Мацюшка, якая давала парады Гаеўскаму і Канапацкаму па арганізацыі работы групы, а таксама канкрэтныя заданні [7, л. 11].

Канапацкі Якаў Матвеявіч стаяў ля вытокаў стварэння патрыятычнай групы на гарбарным заводзе і быў адным з актыўных яго ўдзельнікаў. Вось як ён сам успамінае сваю дзейнасць у мінскім падполлі: "Знаемы майстар з гарбарнага завода Гаеўскі Фаўстын пазнаёміў мяне са сваім сынам Уладзімірам, які пасля акупацыі Мінска ўладкаваўся на працу на завод у 1-ы цэх, дзе працаваў яго бацька. З Уладзімірам Гаеўскім мы дамовіліся аб сумеснай дзейнасці супраць немцаў. У нас была магчымасць выносіць з завода вырабленыя скуры буйнога рагатага ската, свіней, коз і хаваць іх у загаддзя прызначаных месцах, каб потым, у зручны момант, перадаць партызанам. У пачатку 1942 г. я пазнаёміўся з сувязным партызанскага атрада "Дядзькі Васі" Ягоравым Васілем Ягоравічам, які сам ці са сваей жонкай забіраў у мяне скуры і адвозіў на калесах у бок Бягомля. Сувязныя ад партызан за скурамі прыязджалі да мяне на кватэру ці да маей сястры Розы, якая жыла па вуліцы Крапоткіна. Яна разам з мужам Малаковічам Іванам працавала на пункце квашэння пладоваагароднінңай базы № 2 і дапамагала мне хаваць вынесеныя скуры. Таксама скуры я хаваў у цёткі сваёй жонкі Фацімы, якая жыла па вуліцы Леніна, прыносіў скуры і аднаму старому, што жыў каля ТЭЦ-2, а таксама ў хату ў канцы вуліцы Чырвонаармейскай, дзе жыла сям'я Белан. Вырабленыя скуры я выносіў з завода, абвязаўшыся імі вакол пояса. Час ад часу атрымлівалася выносіць адразу некалькі штук [7, л. 59]. Па сумеснай працы ведаю некалькіх чалавек, якія дапамагалі мне даставаць скуры на самім заводзе: Пятровіч Зінаіда Іосіфаўна і Наркевіч Рэгіна Іосіфаўна, якія прыносілі скуры ў адпаведнае месца (да завадской крамы), адкуль я іх і забіраў. Больш усяго скур прыносілі Лямперт і Гаеўскія Фаўстын і Уладзімір. Мне прыходзілася бываць у партызан атрада "Дядзькі Васі", дзе сустракаўся з Егоравым Васілем і Валастных Яўгенам. У мястэчку Смілавічы служыў у паліцыі і дапамагаў партызанам мой стрыечны брат, якому я паведаміў, што ў хуткім часе разам з іншымі

людзьмі з завода паеду за соллю. Брат перадаў гэтую інфармацыю партызанам, якія спынілі машыну і забралі соль. Мой стрыечны брат, Палтаржыцкі Джымал Якаўлевіч, быў у складзе І-й Мінскай партызанскай брыгады, для якой я таксама перадаваў скуры" [7, л. 60].

Аднак дзейнасць падпольшчыкаў была выкрыта немцамі ў сакавіку 1944 г. Па падазрэнню ў сувязях з партызанамі разам з некаторымі іншымі членамі групы былі арыштаваны Канапацкі Якаў Матвеявіч і яго сястра Роза Матвеяўна. Яны мужна трымаліся на допытах, нікога не выдалі і ні ў чым не прызналіся [7, л. 17]. Канапацкі Якаў Матвеявіч свой арышт звязвае з наступным выпадкам: сяброўка яго жонкі была знаёмай немца, магчыма, антыфашыста, які даў ей пісталет. Якаў Матвеявіч пісталет забраў і перадаў яго палоннаму Ахмету, які працаваў у сталовай. На думку Канапацкага Я.М., Ахмет яго і выдаў [7, л. 60]. Так ці інакш, Якаў Матвеявіч быў вывезены ў канцэнтрацыйны лагер у Францыі. У канцы вайны ён апынуўся ў амерыканскай зоне акупацыі і ў 1945 г. вярнуўся на Радзіму. Канапацкі Якаў Матвеявіч за свой уклад у перамогу над агульным ворагам атрымаў наступныя медалі: "За баявыя заслугі", "Партызану Айчыннай вайны" 1-й і 2-й ступеней, "30 гадоў Узброеных Сіл СССР" [7, л. 25].

Таксама трэба звярнуць увагу на постаць мінскага татарына, удзельніка падполля, Александровіча Хасана Мустафавіча, які быў з чэрвеня 1942 г. наборшчыкам газеты "Звязда" у акупаваным Мінску, яе другога, трэцяга, чацвёртага і пятага нумароў. Апошні нумар, на жаль, не выйшаў з прычыны масавых арыштаў падпольшчыкаў. Газета "Звязда" адыгрывала значную ролю ў актывізацыі партызанскага руху і партыйнага падполля на тэрыторыі Беларусі. Хаця афіцыйна яна лічылся органам Мінскага падпольнага гаркома КП(б)Б, яе экзэмпляры выходзілі далёка за межы Мінскай вобласці.

Александровіч Х. М. нарадзіўся ў Мінску ў 1900 г. У 1914 г. ён пачаў сваю працоўную дзейнасць у якасці кур'ера ў Мінскай газеце "Капейка", а ў 1915 г. паступіў вучнем-наборшчыкам у друкарню гэтай газеты. Пасля рэвалюцыі працаваў наборшчыкам у 1-й Савецкай друкарні, а з 1920 г. па 1930 г. – у друкарні імя І.В. Сталіна. На працягу наступных трох гадоў займаў пасаду намесніка старшыні камітэта па справах друку пры СНК БССР. У 1933 г. пачаў вучобу ў Беларускім Дзяржаўным Камуністычным інстытуце Журналістыкі імя С.М. Кірава. Пасля атрымання вышэйшай адукацыі, ён быў накіраваны ў Дзяржаўнае выдавецтва БССР, дзе спачатку быў галоўным рэдактарам дзіцячай літаратуры, а з 1938 г. і да Вялікай Айчыннай вайны працаваў намеснікам дырэктара выдавецтва [8, л. 2].

У пачатку лістапада 1941 г. кватэру Хасана Мустафавіча па вуліцы Выдавецкай, д. 10/6 наведаў У.С. Казачонак, якога прыслалі з-за лініі фронта для падпольнай працы. Ён прапанаваў гаспадару дапамагаць яму ў гэтай дзейнасці. Казачонак прынес з сабой прамову Сталіна ад 3 ліпеня 1941 г., якую яны разам перапісвалі і распаўсюджвалі па акупаванаму Мінску. Пачынаючы з гэтага часу Александровіч далучыўся да падпольнай працы, выконваючы розныя даручэнні Казачонка. Праз некаторы час друкарня з кватэры Александровіча была перанесена на вуліцу Выдавецкую, д. 10, дзе жыла Тацціяна Міхайлаўна Якавенка. Праз 16 год у пісьме сакратару ЦК КПБ К.Т. Мазураву Х.М. Александровіч пісаў: "У гэтым доме (вул. Выдавецкая, д. 10), у пакоі тав. Грышына мной былі набраны і надрукаваны 2-гі, 3-ці і 4-ты нумары падпольнай газеты "Звязда" (5-ы нумар быў толькі набраны). У падпольнай друкарні была надрукавана "Прысяга беларускага партызана", а таксама 7 лістовак і паведамленняў Савецкага інформбюро" [10, л. 61].

Дзеля зручнасці набора газеты, так як у падпольшчыкаў не было некаторых неабходных матэрыялаў, у тым ліку і касы, жонка Хасана Александровіча Галіна Адамаўна пашыла па колькасці тыпаграўскіх знакаў мяшочкі, у якія размяшчалі па аднаму знаку. Гэтыя мяшочкі раскладаліся па падрыхтаванаму Александровічам на паперы чарцяжу касы, і затым пачынаўся набор. Было вельмі зручна ў выпадку небяспекі пераносіць тыпаграфію з аднаго месца на другое. Газета друкавалася ўручную. Але, усе ж такі, тыражы "Звязды" і лістовак у сярэднім складалі 4-5 тысяч экзэмпляраў.

Акупанты ўсімі намаганнямі шукалі падпольную друкарню. За яе выдачу яны прызначылі ўзнагароду спачатку ў 50 тыс. акупацыйных марак, а затым 75 тыс. Арышты падпольшчыкаў здараліся ўсё часцей. Аб далейшых падзеях свайго жыцця Александровіч Х.М. пісаў: "Пасля арышту Ваціка (В. Нікіфарава – аўт.) 28 верасня 1942 г. шрыфты і матэрыялы з Выдавецкай вуліцы мы з Казачонкам перанеслі на падворак дома, дзе жыла Савіцкая (рэдактар 2-4-га нумароў газеты "Звязда"), а затым у падвал 3-га дома Саветаў па вул. М. Горкага, частку шрыфтоў схавалі ў маей кватэры. У сярэдзіне кастрычніка 1942 г. я пазнаёміўся з Калейнікавым Пятром, які па даручэнню падпольшчыкаў тады працаваў у гарнізоннай бане на Ніжнім рынку, куды мы з Казачонкам і перанеслі шрыфты з падвалу 3-га дома і маей кватэры" [9, с. 134-135]. Менавіта тут, у лазні, у гэтыя складаныя часы для мінскага падполля Александровічам Х. М. была надрукавана лістоўка (каля 1000 экзэмпляраў) "Да насельніцтва Беларусі", якая заклікала мінчан да ўзмацнення барацьбы супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Александровіч Х.М. не толькі набіраў і друкаваў, але і распаўсюджваў газету і лістоўкі сярод рабочых электрастанцыі, дзе ён па даручэнню падпольшчыкаў працаваў чорнарабочым. Вывешваў іх на вуліцы пад акенцамі, ідучы раніцай на працу, а таксама раскідваў лістоўкі ў канвертах у месцах, дзе збіраліся рабочыя. Пасля таго, як згубіліся сувязі з падпольшчыкамі, Александровіч Хасан Мустафавіч пайшоў у партызаны. Так, з 12 лістапада 1942 г. ён працягваў барацьбу супраць ворагу ў партызанскім атрадзе імя А.В. Суворава, брыгады імя І.В. Сталіна, якая дзейнічала ў Баранавіцкай вобласці [11, л. 98]. У ўліковай картачцы Александровіча Х.М., якая захоўваецца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, адзначаецца, што ў атрадзе ён займаў пасаду палітківраўніка роты. Ёсць таксама запіс, што ён прапаў без вестак, але наступны запіс сведчыць, што ён вярнуўся ў атрад 8 студзеня 1943 г. і, што быў на выкананні службовага задання ў падполлі мінскага гаркома. Пасля Вялікай Айчыннай вайны і да сваей смерці ў 1959 г. ён жыў у Мінску і працаваў загадчыкам вытворчага адзела выдавецтва Акадэміі навук БССР. Александровіч Х.М быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені, медалем "За адвагу" і іншымі [9, с. 136].

18-гадовым добраахводцам пайшоў на фронт у 1944 г. сын Хасана Мустафавіча – Іосіф, стаў разведчыкам артэлірыйскага палка, удзельнічаў у вызваленні Беларусі, дайшоў да Берліна. Дамоў вярнуўся кавалерам сямі медалёў [9, с. 136].

Такім чынам, на падставе прыведзеных, далека няпоўных дадзеных, можна зрабіць выснову, што мінскія татары, разам з прадстаўнікамі татарскага насельніцтва з іншых месцаў Беларусі, прымалі непасрэдны ўдзел у барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, вызваляючы тэрыторыю Беларусі ад ворагу.

***Літаратура:***

1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (Далей – НАРБ). Фонд 1399. – Воп. 1. – Спр. 762.

2. Лыч, Л. Татары Беларусі на пераломах сацыяльна-палітычных эпох (XX – пач. XX ст.) / Л. Лыч. – Мінск: Кнігазбор, 2007. – 76 с.

3. НАРБ. Фонд 1405. – Воп. 1. – Спр. 898. Списки личного состава, раненых, погибших и пропавших без вести партизан отряда.

4. НАРБ. Фонд 1450. – Воп. 7. – Спр. 116. Отряд им. А.В. Суворова бригады "Народные мстители" им. В.Т. Воронянского.

5. НАРБ. Фонд 1405. – Воп. 1. – Спр. 808. Рапорты и донесения о боевой и диверсионной деятельности бригады, сведения и ведомости боевого и численного состава об уровне заболеваемости в бригаде, количестве раненых и погибших, характеристики, списки партизан, представленных к правительственным наградам, командированных, раненых, погибших и расстрелянных.

6. НАРБ. Фонд 1450. – Воп. 7. – Спр. 43, ч. 2. 1-й отряд бригады "Железняк".

7. НАРБ. Фонд 1346. – Воп. 1. – Спр. 282. Постановление бюро Минского горкома КПБ от 30 января 1985 г. о признании деятельности на минском кожевенном заводе "Большевик" подпольной патриотической группы в 1941-1944 гг. и приложения к нему.

8. НАРБ. Фонд 1346. – Воп. 1. – Спр. 86. Характеристики активных участников Минского партийного подполья в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941-июль 1944 гг.) (приложение к справке комиссии ЦК КПБ от 1 декабря 1959 г.).

9. Иоффе, Э. К вопросу об участии татар в Великой Отечественной войне на территории Беларуси / Э. Иоффе // Ісламская культура татараў-мусульман Беларусі, Літвы і Польшчы і яе ўзаемадзеянне з беларускай і іншымі культурамі: матэрыялы другой міжнароднай навук.-практ. канф., Мінск, 19-20 траўня 1995 г. / Бел. дзярж. пед ін-т імя М.Танка і інш.; рэдкал.: І. Канапацкі [і інш]. – Мінск, 1996. – Ч.1. – С. 130-137.

10. НАРБ. Фонд 1346. – Воп. 1. – Спр. 73.

11. НАРБ. Фонд 1450. – Воп. 2. – Спр. 346.

Ю.Д. Данилов г. Брест

## МЕРОПРИЯТИЯ ВОЕННОЙ РЕФОРМЫ 1924-1928 гг. В ФОРМИРОВАНИЯХ КРАСНОЙ АРМИИ НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛАРУСИ

Поиск путей эффективного военного строительства армии Советской республики в начальный период был обусловлен рядом обстоятельств исключительно объективного характера. Основными из них являлись: состояние боеспособности регулярных армейских соединений и частей бывшей царской армии, возможность их использования в интересах советской власти и собственно экономические ресурсы Советской России по содержанию армии.

В октябре 1917 года армия насчитывала более 7 миллионов солдат и офицеров, из них в действующей армии было около 158 тысяч офицеров, более 65 тысяч военных чиновников и врачей и более 5,5 миллиона солдат и унтер-офицеров. Только в европейской части страны на фронте стояли 184 пехотных и 39 кавалерийских дивизий - более двух миллионов штыков, 102 тысячи сабель.

Самым страшным бедствием армии было дезертирство. С августа 1914-го до февраля 1917 года, то есть за 41 месяц войны, из ее рядов дезертировало около 200 тысяч солдат. С февраля по август 1917 года, то есть за 7 месяцев, бежало еще 170 тысяч человек, а с сентября до ноября - целых полтора миллиона![1].